**УДК 76(476)(091)**

# БЕЛАРУСКАЯ ГРАФІКА. ЛІНАРЫТ. ПОГЛЯД У МІНУЛАЕ

***В.В. Шамшур***
*Віцебск, УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”*

***Анатацыя:*** *Даследванне прысвечана гісторыі беларускай графікі. Разглядаюцца асноўныя этапы развіцця лінарыта.*

***Summar:*** *The research is dedicated to the history of Belorussian graphics. The main stages of the development of linoengraung are observed in the article.*

Далёкія 60-я гады мінулага стагоддзя. Мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. У калідорах шэрагі велічных антычных злепкаў адлюстроўваюцца ў бліскучых паркетных падлогах, жывапісныя майстэрні на трэцім паверсе яшчэ захоўваюць рэшткі шкляных столляў. У сталіцу “паўночнай губерні” з вёсак і мястэчак з’ехаліся юнакі і дзяўчаты, каб далучыцца да мастацтва. У вольны час ходзім на эцюды, наведваем мастацкія выставы ў адзінай выставачнай зале на вуглу вуліц Леніна і Савецкай. Там упершыню ўбачылі лінарыты Р.Клікушына, ужо вядомага ў той час беларускага графіка: серыі гравюр “Вясковыя краявіды”, “Віцебск – любоў мая”, “Стары Віцебск”, асобныя творы. Можна з упэўненасцю сказаць, што яго творчасць у гэтай галіне на доўгія гады вызначыла цікавасць студэнтаў і выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта да графікі і, у прыватнасці, да лінарыту. У 70-80 гадах многія выпускнікі рабілі дыпломныя работы менавіта ў гэтай тэхніцы і паспяхова абараняліся. Зразумела, што час змяніў адносіны да гравюры, якая патрабуе шмат увагі і творчай энергіі.

Звычайна лінарыт у мастацвазнаўчых даследваннях разглядаецца ў кантэксце агульнага развіцця графікі і гравюры, дзе асноўнае месца займае дрэварыт, афорт і іншыя тэхнікі. Пры гэтым самадастатковая гісторыя лінарыта застаецца найменш даследаванай, хоць у 20-м стагоддзі сярод іншых тэхнік ён займаў як эстамп па сваёй значнасці вызначальнае месца. Напрыклад, дастаткова прыгадаць “эстампны бум” 50-х – 60-х гадоў. Менавіта тады лінарыт стаў найбольш характэрным і распаўсюджаным відам станковай графікі, і менавіта тады з’явіўся дзейсны лозунг “Эстамп у кожны дом!”

Абмежаваны аб’ём публікацый не дазваляе паказаць больш пашырана абставіны з’яўлення і развіцця гэтай тэхнікі гравюры. Зыходзячы з умоў, мэтазгодным будзе азначыць толькі яе асноўныя і вызначальныя вехі. Лінарыт, як від графічнай тэхнікі, у параўнанні з гравюрай на дрэве і метале даволі малады. Уваход яго ў мастацкую практыку, безумоўна, не мог адбыцца без з’яўлення ў другой палове

Репозиторий ВГУ

XIX стагоддзя ў Вялікабрытаніі навінкі таго часу – рулоннага матэрыялу, прызначанага ў асноўным для пакрыцця падлогі – лінолеуму.

У якасці матэрыялу для гравюры лінолеум пачаў ужывацца ў Заходняй Еўропе недзе ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Для мастакоў гэта быў сапраўдны падарунак часу. Яго тэхнічныя і мастацкія якасці адразу прыцягнулі да сябе ўвагу графікаў, асабліва маладых. Па-першае гэта быў у параўнанні з дрэварытам, які патрабаваў каштоўных парод драўніны, даволі танны матэрыял, па-другое – яго амаль неабмежаваныя выяўленчыя якасці. Мяккі, падатлівы, аднародны лінолеум даваў магчымасць выкарыстоўваць у гравюры як вялікія лаканічныя плямы, так і разнастайныя белыя альбо чорныя штрыхі і іх спалучэнні. У па-трэцяе, можа і не зусім падыходзячая да мастацтва якасць – яго памеры. Менавіта магчымасць ствараць у параўнанні з афортамі і дрэварытамі вялікія адбіткі садзейнічала таму, што лінарыт адразу адышоў ад ілюстратыўнага ды і рэпрадукцыйнага абслугоўвання і заняў трывалае месца ў мастацкай практыцы ў асноўным як прадстаўнік станковай графікі. Але ў сувязі з гэтым трэба адзначыць, што ў пазнейшы час з'явіліся гатункі лінолеуму з новымі тэхнічнымі якасцямі, на якіх можна рабіць вельмі вытанчаныя творы: ілюстрацыі, мініяцюрныя экслібрысы і іншае. Такія адбіткі часам мала чым адрозніваюцца ад дрэварыту. Ужо ў 1906 годзе, як сведчаць дакументы, на мастацкай выставе ў Парыжы экспанавалася серыя лінарытаў, якія выклікалі вялікую зацікаўленасць гледачоў.

Зразумела, што развіццё беларускай графікі, як і ўсяго мастацтва, ішло і ідзе не ізалявана, а ў цесных узаемасувязях і ўзаемадзеянні з мастацтвам суседніх народаў. У гэтым сэнсе, пачынаючы недзе з XVIII стагоддзя, значнае месца займае рускае мастацтва. Калі высвятляць, хто з рускіх мастакоў першым на практыцы пазнаёміўся з лінолеумам як мастацкім матэрыялам, то ўпэўнена можна назваць імя В.Кандзінскага, родапачынальніка і тэарэтыка абстрактнага мастацтва. Не выключаецца магчымасць, што, будучы ў Парыжы ў 1906 годзе, ён бачыў на названай вышэй мастацкай выставе работы ў гэтай тэхніцы і стварыў свае першыя, прытым каляровыя лінарыты, пазначаныя 1907 годам. Безумоўна, што тады яшчэ параўнальна малады вялікі рэфарматар мастацтва, здолеў разгледзіць схаваныя ў лінолеуме патэнцыяльныя творчыя адкрыцці і магчымасці тэхнічных эксперыментаў. Далей належыць назваць імя вядомага рускага графіка І.Паўлава, буйнейшага спецыяліста ў галіне гравюры, папулізатара яе мастацтва і тэхнікі. У 1911 годзе ён стварае цэлую серыю каляровых лінарытаў "Старая Масква". Паўлаў па праву лічыцца заснавальнікам чорна-белага і каляровага рускага лінарыта,

Репозиторий ВГУ

яму належыць распрацоўка яго тэхнікі і прыёмаў друку. Вялікае значэнне ў той час для развіцця гравёрнага мастацтва, у тым ліку і беларускага, мелі напісаныя ім дапаможнікі “Гравёр-самавук” (М. – Л., 1931) і “Тэхніка гравюры на дрэве і лінолеуме” (М., 1952). У шэрагу знакамітых творцаў таго часу трэба назваць М. Маторына, В. Фалілеева, П. Стараносава, У. Сакалова, П. Паўлінава, А. Астравумаву-Лебедзеву, В. Фаворскага і іншых. Знамянальна, што лінолеум як даступны і падатлівы матэрыял з шырокімі мастацкімі магчымасцямі прываблівае да сябе не толькі графікаў, але і жывапісцаў. Так, вядомы рускі мастак Б.Кустодзіеў стварыў нізку выдатных станковых лінарытаў, па-майстэрску выкананых, з яркімі святлоценявымі і дэкаратыўнымі эфектамі, што характэрна для яго жывапісных твораў.

Вызначыць дакладны час з’яўлення першых работ на Беларусі, выкананых у тэхніцы лінарыта даволі складана. У цэлым жа беларуская графіка, у тым ліку і станковая, мае даўнія і багатыя традыцыі, звязаныя ў першую чаргу з дзейнасцю Ф.Скарыны – знакамітага беларускага асветніка і першадрукара. Менавіта ў яго выданнях з’явіліся першыя ў славянскім свеце графічныя творы, выкананыя ў тэхніцы гравюры. Выдатныя па свайму мастацкаму і прафесійнаму ўзроўню, насычаныя ўзнёслым духам Рэнесанса, яны мелі дзейсны ўплыў на развіццё графічнага беларускага ды і сусветнага мастацтва на працягу многіх гадоў. Пазней на Беларусі ўзнікае шэраг друкарань (у Нясвіжы, Магілёве, Брэсце, Вільні і інш. гарадах), дзе паспяхова развіваюцца розныя тэхнікі гравюры. Вялікае значэнне для развіцця беларускага графічнага мастацтва мела выдатная мастацкая школа, што была створана ў канцы XVIII стагоддзя пры Віленскім універсітэце і ў якой існавала літаграфская майстэрня. Што датычыцца лінарыта, то на Беларусі ён з’явіўся прыблізна ў пачатку XX стагоддзя.

Як сведчаць архіўныя дакументы, прыярытэт грунтоўнага засваення гэтай новай тэхнікі належыць Гомелю. Там у канцы 1919 года была арганізавана мастацкая школа-студыя імя М.Урубеля, дзе працавала графічна-плакатная майстэрня і вяліся практычныя заняткі па вывучэнню графічных тэхнік, у тым ліку і лінарыта. Майстэрняй кіраваў таленавіты графік таго часу А.Быхоўскі – выпускнік Петраградскай школы заахвочвання мастацтваў. Сам кіраўнік актыўна працаваў у гэтай тэхніцы і пакінуў пасля сябе вялікую творчую і педагагічную спадчыну. Вядома таксама, што лінолеум, як даступны і танны матэрыял, шырока выкарыстоўваўся мастакамі Віцебска. У першае гады Савецкай улады ў горадзе былі створаны “Вокны “РОСТА”. Друкарскія дошкі там для тыражавання плакатаў і ўлётак выразаліся з лінолеума.

Першым беларускім графікам, які на працягу ўсяго свайго доўгага жыцця заставаўся адданым лінолеуму, быў А. Тычына (1897–



Репозиторий ВГУ

1986). Яго першыя працы на гэтым матэрыяле адносяцца да 1920 года. Пазней мастак працаваў у галіне кніжнай ілюстрацыі, спрабаваў свае сілы ў дрэварыце, але станковы лінарыт заўсёды займаў вядучае месца ў яго творчасці. Ім створаны вялікія серыі гравюр (галоўным чынам каляровых), прысвечаных Мінску і прыродзе Беларусі. Работы не аднолькавыя па мастацкіх якасцях. Частка з іх стваралася пад ідэалагічным ціскам, вынікам чаго з'явіліся занадта рацыянальныя, безэмацыянальныя гравюры з вытворча-індустрыянальнымі матывамі. Аднак лепшыя аркушы з серый "Мой горад", "Па рэках Беларусі" крануюць сваёй непасрднасцю і цеплынёй, імкненнем паказаць своеасаблівасць беларускай прыроды і сутнасць нацыянальнага быцця.

У шэрагу першых, хто пачаў працаваць у Беларусі па лінолеуме, неабходна назваць таксама С.Юдовіна (1892-1954), вучня вядомага віцебскага мастака і педагога Ю.Пэна. У пачатку 20-х гадоў на аснове сабранага этнаграфічнага матэрыялу ім быў выразаны і надрукаваны рад серый арнаментаў у тэхніцы дрэварыту і лінарыта. У далейшым С.Юдовіным быў створаны цыкл гарадскіх пейзажаў Віцебска, але галоўным чынам у тэхніцы дрэварыта. У час вайны, знаходзячыся ў Ленінградзе, мастак зноў звяртаецца да лінолеуму, як найбольш таннага і даступнага матэрыялу, і стварае вялікую нізку гравюр, прысвечаную пакутнаму блакаднаму гораду.

Па каталогу 1-й мастацкай выставы, якая адбылася ў Мінску ў 1921 годзе відаць, што там даволі прыкметнае месца займала графіка, але лінарыт быў прадстаўлены адзінкавымі работамі. У мастацкую практыку ён уваходзіў не адразу, а паступова. Так, на 1-й Усебеларускай мастацкай выставе ў 1925 годзе лінарыт у параўнанні з выставай 1921 года займаў больш значнае месца. На ёй дэманстраваўся ўжо цэлы шэраг работ А. Тычыны і фінскага графіка А. Вало, які працаваў у той час ў Мінску. Крыху пазней у тэхніцы лінарыта, праўда эпізадычна, пачалі працаваць вядомыя ў даваеныя гады графікі І. Гембіцкі, М. Тарасікаў, Г. Змудзінскі, Ул. Сакалоў.

Таксама як і ў суседніх рэспубліках, найбольшы ўздым і цікавасць да лірарыта прыпадае на канец 50-х – 60-х гадоў. У значнай ступені ўздыму графікі садзейнічала арганізацыя пры Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце графічнага аддзялення, першы выпуск якога адбыўся ў 1959 годзе. Але больш за ўсё гэтая з'ява была выклікана зменамі ў палітычным жыцці краіны. Частковае вызваленне грамадства ад жорсткага рэжыму патрабавала адпаведна больш вольнага і дэмакратычнага мастацтва, носьбітам якога ў выяўленчым мастацтве з'яўляецца станковая тыражная графіка. На выставах 60-х гадоў яна пачынае прыкметна пераважаць, і адно з галоўных месцаў



Репозиторий ВГУ

займае чорна-белы і каляровы лінарыт. Спецыфічныя асаблівасці мовы зрабілі лінарыт здольным найбольш поўна і хутка адлюстраваць свет новых ідэй і вобразаў наступіўшага часу. Пры гэтым добра было відаць тэматычнае і стылістычнае адзінства паміж лінарытам (асабліва чорна-белым) і творамі жывапісу “суровага стылю”. Станковы лінарыт заваёўвае ўсё большае і большае месца ў майстэрнях мастакоў, у выставачных экспазіцыях, у музеях, у жылых і службовых інтэр’ерах. Характэрным становіцца стварэнне не адзінкавых, а цэлых серый эстампаў, аб’яднаных адной задумай і тэмай. Ужо ўвайшлі ў гісторыю нацыянальнага выяўленчага мастацтва серыі лінарытаў вядомых беларускіх графікаў: А. Лось – “Дзеці Белавежжа”, “Людзі на Прыпяці”, “Іграй аб долі шчаслівай”; Н. Паплаўскай – “Дзеці і прырода”; М. Гуціева – “Партызанская сюіта”, “Партызанскія будні”; Л. Асецкага – “Мінскае падполле” і шэраг іншых. Пастаяннымі ўдзельнікамі мастацкіх выстаў таго часу з’яўляюцца Ю.Тышкевіч, С.Герус, А.Захараў, В.Ткачук, Ул.Садзін, А. Кашкурэвіч, Б. Кузьмічоў, М. Макаранка і другія графікі. У іх творчасці значнае месца пачынаюць займаць лінарытныя эстампы. Разглядаючы развіццё беларускай графікі ў 50-60-я гады нельга без увагі пакінуць яе ўзаемаадносіны з мастацкімі пошукамі бліжніх суседзяў і, у першую чаргу, прыбалтыйцаў. Менавіта ад іх ішло дзейснае ўздзеянне на творчую практыку беларусаў. Шырокую вядомасць ў графічным мастацтве таго часу набываюць работы мастакоў В. Юркунуса, Й. Кузмінскаса, С. Красаўскага, А. Скіруцітэ, Х. Ээльмы і іншых, якім належыць прыярытэт стварэння ўласных мастацкіх школ, заснаваных на нацыянальных традыцыях і творчасці майстроў старэйшага пакалення. Графіка, у тым ліку і лінарыт, большасці прыбалтыйцаў вылучалася (і вылучаецца), акрамя нацыянальнага стылю, наватарскімі пошукамі, арыгінальнасцю і разнастайнасцю мастацкіх рашэнняў, пэўнай індывідуальнасцю амаль кожнага графіка. Паказальным прыкладам высокага развіцця і інтарэса да графічнага мастацтва ў Прыбалтыцы і яго папулярызацыі з’яўляліся розныя друкаваныя выданні: каталогі, альбомы, манаграфіі, паштоўкі. Вялікае значэнне для ўзаемнага ўзбагачэння мелі таксама рэгулярныя сустрэчы творцаў, абмен мастацкімі выставамі, удзел у пленэрах.

У наступныя, ужо ў 70-я гады, рады беларускіх графікаў пастУпова папаўняюцца, узрастае іх прафесіяналізм, пашыраецца творчы дыапазон. Больш упэўнена акрэсліваюцца рысы нацыянальнай графічнай школы. 70-я, ды і 80-я гады адзначаны з’яўленнем шэрага наватарскіх, высокамастацкіх работ у тэхніцы лінарыта такіх графікаў, як В. Шаранговіч, браты М. і У. Басалыгі, М. Купава, А. Ільноў, Ю. Кухараў, Я. Кулік, М. Драгун, Г. Грак. На жаль,



Репозиторий ВГУ

абмежаваны аб’ем публікацыі не дазваляе назваць усіх, а тым больш ахарактарызаваць творчыя асаблівасці тых, хто працуе ў гэтай тэхніцы. У творчасці большасці з іх, у адрозненне ад графікаў старэйшага пакалення, дзе часта пераважалі этнаграфічнасць, сюжэтна-апавядальныя матывы, відавочна імкненне да іншасказальнасці або сімволікі, да пастаяннага пошуку асабістага творчага почырку, нацыянальнага стылю і новых тэхнічных прыёмаў.

Пачалося новае тысячагоддзе, а з ім новыя грамадскія адносіны і новыя варункі для мастацтва, вызваныя зменамі часу і не ў малой ступені ўздзеяннем камерцыйных патрабаванняў. Мастацтва гравюры і лінарыта-эстампа паступова адыходзіць на другі план. Як заўсёды, традыцыйна мы кажам “на жаль”. Але гэта натуральная з’ява ў мастацтве, ды і не толькі ў мастацтве. Калі ўлічваць цыклічнасць зменаў усяго сутнага, то магчыма прыйдзе час і ў мастацкую практыку зноў, грунтуючыся на дасягнутым, але на больш высокім узроўні ўвойдзе тыражная графіка. У сучасны момант лінарыт працягвае жыццё ў майстэрнях асобных мастакоў, спецыяльных навучальных установах, у школьных гуртках графікі. Лінолеум для навучэнцаў, дзякуючы даступнасці, прастаце выканання друкарскай формы і самога друку, з’яўляецца незаменным матэрыялам. Бяспрэчна, патрэбна далейшае даследванне гісторыі, збор і аналіз творчай спадчыны графічнага мастацтва Беларусі. Заслугоўвае ўвагі пры гэтым дзейнасць майстэрні графікі мастацка-графічнага факультэта Віцебскага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, якой кіруе член беларускага саюза мастакоў А.Кастагрыз. Ім распачаты збор і сістэматызацыя не толькі скончаных твораў, але ўсіх падрыхтоўчых матэрыялаў, і, увагуле, матэрыялаў, маючых дачыненне да графікі. У далейшым плануецца спроба іх выдання ў выглядзе альбомаў, каталогаў, паштовак, арганізацыя выстаў. Для тых, хто пачынае цікавіцца і займацца гравюрай і, у прыватнасці лінарытам, такія выданні мелі б важнае значэнне ў сэнсе знаёмства з гісторыяй і асаблівасцямі творчасці мастакоў-графікаў, разумення і пасягнення таямніц іх майстэрства.

### *Спіс выкарыстаных крыніц*


1. Каталог 1-й художественной выставки подотдела «ИЗО» Художественного отдела Главполитпросвета БССР. – Мн., 1991.
2. Каталог 1-й Усебеларускай мастацкай выстаўкі. – Мн., 1925.
3. Кликушин Г.Ф. Графика. Каталог юбилейной выставки-ретро к 75-летию со дня рождения. – Витебск, 1996.
4. Русская дореволюционная и советская гравюра и литография в собрании Государственного художественного музея БССР. Каталог. – Мн., 1984.




Репозиторий ВГУ